**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**
**Хроніка**
**культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за кастрычнік 2022 г.**

**<u>Мерапрыемствы ў рамках Тыдня бацькоўскай любові</u>**

На працягу тыдня ў бібліятэках сістэмы адбылася акцыя “Мамам і татам”, у час якой усе бацькі, якія прыйшлі ў бібліятэку, мелі магчымасць скарыстацца сэрвіснымі паслугамі бібліятэк бясплатна. Прыемным сюрпрызам стала ўручэнне бацькам малюнкаў і святочных паштовак ад іх дзяцей.

**11 кастрычніка**

На інфармацыйна-тэматычную гадзіну “Во имя наших матерей” сабраліся навучэнцы старэйшых класаў СШ №3 г. Кобрына. Праваслаўную гутарку «Благадатны Пакроў» правёў святар Свята-Хрыстараждзественскай царквы г. Кобрына іерэй Андрэй Шаўчук. Аб рэпрадуктыўным здароўі моладзі расказаў урач акушэр-гінеколаг Кобрынскай ЦРБ Вераніка Мордань. Прыемным сюрпрызам для гасцей свята сталі музычныя нумары, падрыхтаваныя вакальнай групай “Фантазія”. Мерапрыемства суправаджалася праглядам відэапрэзентацыі “Самы блізкі чалавек”.

*(Бакун, Е. Самым дорогим посвящается / Е. Бакун // Кобрынскі веснік. – 2023. – 21 кастрычніка. – С. 16)*

ЦРБ, 37 чал.

**12 кастрычніка**

“Весь мир начинается с мамы” - пад такой назвай у інфармацыйна-сэрвісным цэнтры сумесна з падапечнымі Кобрынскага ТЦСАН, псіханеўралагічнага дома-інтэрната прайшла літаратурна-музычная кампазіцыя. Падапечныя дама-інтэрната падрыхтавалі літаратурную кампазіцыю “Любите ваших матерей”. У выкананні Святланы Еўдасюк, Дзмітрыя Іванова, Андрэя Рачкова (падапечных дома-інтэрната), творчага калектыву Кобрынскага ТЦСАН клуба “Встреча”, вакальнай групы “Фантазия” Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі гучалі вершы і песні, якія праслаўляюць самых любімых на зямлі жанчын - маці. Мерапрыемства адбылося ў рамках праекта “Библиотека без границ”.

ЦРБ, 64 чал.

**13 кастрычніка**

Сумесна з прадстаўнікамі Брэсцкай абласной арганізацыі АА “БелТІЗ” адбыўся вечар-дывертысмент “Нет выше звания, чем МАМА!”. Адкрыла мерапрыемства кіраўнік Кобрынскага аддзялення АА “БелТІЗ” Валянціна Мікалаеўна Смяховіч. Гарачымі апладысментамі сустракалі прысутныя песенныя кампазіцыі ад вакальнай групы “Фантазія”, членаў АА “БелТІЗ” Нікіцюка П.П., Машонік А.А., Кірычэнка А. П. і Гурыш Т. А.

ЦРБ, 20 чал.

**19 кастрычніка**

Літаратурна-музычны вечар «Самые главные люди на свете» арганізаваны і праведзены вакальнай групай «Фантазія». Вядучыя пазнаёмілі сваіх гледачоў з двума значнымі датамі – Днём маці і Днём бацькі, з малавядомымі вехамі гісторыі гэтых дат, прадставілі вершаваныя творы пра бацькоў. У праграме музычнага вечара прагучалі любімыя ўсімі лірычныя кампазіцыі мінулых гадоў у выкананні салістаў вакальнай групы ЦРБ.

ЦРБ, 36 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

**3 кастрычніка**

У рамках маладзёжнага патрыятычнага праекта ЦРБ “Беларусі роднай славутыя крокі” для навучэнцаў 9 класа ДУА “Гарадзецкая сярэдняя школа Кобрынскага раёна” і студэнтаў Кобрынскага ДКСТ прайшоў гістарычны экскурс “Генацыд. Трагічныя старонкі гісторыі”. Мерапрыемства суправаджалася паказам відэапрэзентацыі “Памяць і боль беларускай зямлі”.

ЦРБ, 51 чал.

**6 кастрычніка**

Падчас правядзення інфармацыйнай гадзіны “Алкоголь – война против тебя”, лекар па медыцынскай прафілактыцы кобрынскага цэнтра «Арыенцір» Вольга Філіпеня распавяла студэнтам Кобрынскага ДПТК пра згубнае ўздзеянне алкагольных напояў на арганізм чалавека, пра піўны алкагалізм. Мерапрыемства суправаджалася паказам відэапрэзентацыі “Личность и алкоголь”.

ЦРБ, 18 чал.

**10 кастрычніка**

Гадзіна здароўя “В трезвости - сила!” праведзены пры ўдзеле ўрача па медыцынскай прафілактыцы Кобрынскай ЦРБ Святланы Васільевай ў рамках інфармацыйна-асветніцкага праекта “Здаровая моладзь - здаровая нацыя”. Навучэнцы Кобрынскага ДКСА слухалі інфармацыю аб уплыве спіртного на арганізм чалавека, адказвалі на пытанні анкеты “Мы - здоровое поколение Брестчины”.

ЦРБ, 21 чал.

**24 кастрычника**

Творчы вечар сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі, кіраўніка літаратурнага клуба “ПаэтыКо” Наталлі Кандрашук прайшоў з нагоды 50-годдзя паэтэсы і 20-годдзя першай публікацыі яе паэтычных твораў у калектыўным зборніку. Наталля Пятроўна чытала вершы, расказвала пра свой шлях у літаратуру, дасягненні і новыя кнігі, адказвала на шматлікія пытанні прысутных. Павіншаваць юбілярку прыйшлі бібліятэкары, сябры клуба, знаёмыя, прыхільнікі творчасці літаратара. Дзень мерапрыемства таксама быў і днём нараджэння сябра клуба “ПаэтыКо” Зінаіды Навасад, якая

атрымала ў падарунак ад Наталлі Кандрашук яе апошнюю кнігу вершаў "Лабірынты летуценняў". Аздобілі свята песні ў выкананні вакальнага гурта бібліятэкараў "Фантазія".

*(Елизарова, Ж. Свет нельзя утаить / Ж. Елизарова // Кобрынскі веснік. – 2023. – 21 кастрычніка. – С. 16)*

ЦБ, 30 чал.

## Выдавецкая дзейнасць

**9 кастрычника**

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры прайшла прэзентацыя выдадзенага бібліёграфамі цэнтральнай раённай бібліятэкі да 460-годдзя з часу першага згадвання ў гістарычных крыніцах в. Мацы Кобрынскага раёна інфармацыйна-бібліяграфічнага выдання «Малая радзіма вялікіх людзей» - чарговага выдання з серыі «Па вёсках нашага краю».

*(Курачук, С. Натхнёныя малой радзімай / С. Курачук // Кобрынскі веснік. – 2023. – 21 кастрычніка. – С. 16)*

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
3 85 81